У любові і творчасці

30.09.2022 - 20:34 Адукацыйная прастора, Навіны рэгіёнаў

“Настаўніцкая газета” напярэдадні Дня настаўніка вітала педагогаў Мазыра і Калінкавіч.



Нагода для віншавання была двайная — напярэдадні былі падведзены вынікі конкурсу на лепшую падпіску на друкаванні СМІ Выдавецкага дома “Педагагічная прэса”. І ў намінацыях гарадскіх (больш за сто тысяч насельніцтва) устаноў адукацыі дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі пераможцам стаў Мазыр.

Дыплом І ступені і каштоўныя прызы, шматфункцыянальную аргтэхніку, кіраўніку аддзела адукацыі Ларысе Папковай уручыла галоўны рэдактар “Настаўніцкай газеты” Кацярына Дубінская. Ларыса Аляксееўна расказала пра святочнае ўшанаванне педагогаў раёна і асабіста азнаёміла з работай дзвюх устаноў адукацыі — Руднянскай сярэдняй школы і 12-й школы Мазыра. Абодва калектывы ўзначальваюць дастойныя педагогі — Аляксей Кохан і Канстанцін Хамутоўскі.

> ***У сярэдняй школе № 7 Калінкавіч дух заняло ад праектаў, дзе ледзь не кожны — тэма для нашых публікацый.***

І з Калінкавічамі сяброўства ў нашай газеты даўняе. Сярод шматлікіх пераможных дыпломаў на сцяне ў начальніка аддзела адукацыі Калінкавіцкага райвыканкама — ад “Настаўніцкай”, аб паспяховым удзеле ў прэс-туры газеты. Іна Віктараўна Губар з гордасцю і радасцю расказала пра новыя поспехі адукацыі раёна, новыя формы работы, пра акцэнты ў духоўна-маральным выхаванні дзяцей. У пацвярджэнне сказанага — знаёмства з пераможцам абласнога конкурсу сярод дашкольных устаноў вобласці, дашкольным цэнтрам развіцця дзіцяці. Яго кіраўнік Людміла Пячэрская прадэманстравала няпростую працу педагогаў з малышамі з цяжкасцямі маўленчага развіцця. Дарэчы, сярод педагогаў нямала маладых спецыялістаў, да якіх у цэнтры асаблівае бацькоўскае стаўленне… А вось у сярэдняй школе № 7 дух заняло ад праектаў, дзе ледзь не кожны — тэма для нашых публікацый. І кітайскую мову тут вывучаюць, і ў школьным тэатры “Глобус” іграюць, і робататэхніку з высокімі тэхналогіямі ў новым класе асвойваюць, і спартыўнай журналістыкай займаюцца. Школа хоць і старэнькая, але вельмі акуратная, утульная, з парога адчуваеш: педагогі яе любяць. Дырэктар Сяргей Хадзько, які за дзень па 14—16 тысяч крокаў намотвае — палічана! — смяецца: “Тут яшчэ на два дырэктарскія тэрміны гаспадарчай работы!” Іна Віктараўна дапаўняе: “Усё атрымліваецца, бо ёсць галоўнае — дух стварэння і любові да прафесіі”.



Кацярына РУМЯНЦАВА.

Актуальные новости

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее



Сябраваць анлайн

12.02.2023



Хто хоча — той даб'ецца

12.02.2023



Няма нічога немагчымага…

10.02.2023

НОВОСТИ

«Белковое голодание испытывает каждый из нас». Чем опасен дефицит белка, и как его избежать

Калектыў Выдавецкага дома «Педагагічная прэса» віншуе з надыходзячым Новым годам і Раством Хрыстовым

Як жывуць амаль 3 сотні адораных дзяцей пад адным дахам? Зазірнулі ў Брэсцкі абласны ліцэй імя П. М. Машэрава

Выдавецкі дом «Педагагічная прэса» далучыўся да акцыі «Нашы дзеці»: мы завіталі ў дзіцячы дом сямейнага тыпу

Дызайнер пачынаецца з натхнення — так лічыць кіраўнік узорнай студыі моды «Сілуэт» Ірына Стрэльчык

АВТОРСКИЕ КОЛОНКИ

ИГОРЬ ГРЕЧКО

СВОЙ БРЭНД



ЕКАТЕРИНА ДУБИНСКАЯ

ОБРЕТАЯ РАДОСТЬ И ГАРМОНИЮ



НАТАЛИЯ БУШНАЯ

ВОСПИТАТЬ ЧЕЛОВЕКА



©2014-2024 Редакционно-издательское учреждение «Издательский дом «Педагогическая пресса»

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее